© 2020 Katedra Białorutenistyki UW. Wydanie w otwartym dostępie na licencji **CC BY-NC-ND** (https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/4.0/deed.pl)

**ACTA ALBARUTHENICA 20: 2020**
DOI: 10.32612/uw.18988091.2020.20.pp.273–274

**Антон Францішак Брыль / Anton Bryl**
*незалежны даследчык / independent researcher*
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-1522-2445
e-mail: *anton.bryl@gmail.com*

# Да біяграфіі Бенедыкта Янкоўскага

*A Note on the Biography of Benedykt Jankowski*
*Przyczynek do biografii Benedykta Jankowskiego*

У другой палове 1850-х гадоў у віленскай друкарні Адама Завадскага мусіла выйсці кніга Бенедыкта Янкоўскага, цікавага польскамоўнага паэта, пра якога нам вядома надзвычай мала [Bryl 2014]. Ён адрасаваў свае лісты ў 1856 г. з Пецярбурга, а ў 1859 г. – з-пад Доўска ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Зваротны адрас у другім выпадку запрашаў пісаць "Его Благородию Венедикту Яковлевичу Янковскому". Дзеянне пралога яго драматычнай фантазіі *Чары* і аднаго з далучаных да яе санетаў адбываецца на Палессі, "у ціхай палескай краіне". Побытавыя дэталі ў вершах малююць вобраз лірычнага героя як дробнага правінцыйнага шляхціца. Вось, уласна, і ўсё: вядомым паэт не зрабіўся, бо ў пачатку 1857 г. кнігу забараніла духоўная цэнзура, не ўпадабаўшы, відаць, прыхільнасці аўтара да містыкі. Ад гэтай гісторыі засталася копія рукапісу [LMAB, RS 18–25], а таксама два лісты Б. Янкоўскага да А. Завадскага і рахунак ад выдавецтва [LMAB, RS 7–654] – усё ў зборах бібліятэкі АН Літвы. Лісты цяпер дасяжныя, між іншым, у электронным выглядзе на сайце бібліятэкі [*Laiškai*…, online].

Праглядаючы спіс спраў аб зацвярджэнні ў дваранстве, што захоўваюцца у зборах Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, мы заўважылі, што Янкоўскіх у Магілёўскай і суседняй Мінскай губерні было не збыт многа, і вырашылі даслаць у архіў запыт: ці няма сярод шукальнікаў дваранскага звання ў гэтых дзвюх губернях Венядзікта Якаўлевіча Янкоўскага (згодна з традыцыяй русіфікацыі імёнаў у тагачасных дакументах), які мог ліставацца з выдавецтвам ў 1856–1859 гг. Шанцы не здаваліся вялікімі, але ў выніку прыйшоў найлепшы з магчымых адказаў: знайшоўся роўна адзін кандыдат з такім поўным іменем, які жыў у патрэбны час. Звесткі з адпаведнай справы, з якою атрымалася пазнаёміцца бліжэй па копіях, можна пераказаць досыць сцісла. Венядзікт Якаўлевіч Янкоўскі, другі сын Якава Васілевіча Янкоўскага і яго жонкі Марыі, нарадзіўся ў 1824 годзе (дакладнай даты

няма) і быў ахрышчаны ў Слуцкім парафіяльным касцёле [РГИА 1343–34–2263, л. 49]. Род іх карыстаўся гербам Ястрабец [РГИА 1343–34–2263, л. 20v] і быў даволі стары, але збяднелы: да справы ім давялося прыкладаць даведку, што яны не маюць сродкаў на дакументы на гербавай паперы [РГИА 1343–34–2263, л. 69]. Маёнтак Малейкі, якім іх продкі валодалі ў 1678 г., быў прададзены яшчэ ў сярэдзіне XVIII ст. [РГИА 1343–34–2263, л. 90v]. У 1854 г. Янкоўскія – у тым ліку Якаў з сынамі Іосіфам, Венядзіктам і Васілём – былі зацверджаныя ў спадчынным дваранстве [РГИА 1343–34–2263, л. 91–91v]. У верасні 1855 г. Венядзікт Якаўлевіч атрымаў копіі адпаведных дакументаў [РГИА 1343–34–2263, л. 103–104v].

Гэтыя звесткі пасуюць да таго нешматлікага, што мы ведаем пра аўтара *Чараў*, і можна прыняць, што перад намі сапраўды ён. Разам з тым даводзіцца прызнаць, што новыя рысы мала дадаюць да партрэта і карысныя найперш як зачэпкі для будучых даследнікаў. Зусім няясным застаецца лёс паэта пасля 1859 г. Нейкі Венядзікт Янкоўскі працаваў у 1861 г. у Маскоўскай 2-й гімназіі [Гулевич 1885: 104], аднак крыніца не называе нават імя па бацьку таго педагога, і па настолькі скупых звестках цяжка зразумець, ці мог гэта быць наш герой.

## Бібліяграфія

Bryl Anton Franciszek. 2014. *Poleskie Sonety Benedykta Jankowskiego.* "Pamiętnik Literacki" z. 2: 159–163.

Gulevič Sergej. 1885. *Istoričeskaâ zapiska o 50-letii Moskovskoj 2-j gimnazii (1835–1885).* Moskva: tip. E. Lissner i Û. Roman [Гулевич Сергей. 1885. *Историческая записка о 50-летии Московской 2-й гимназии (1835-1885).* Москва: тип. Е. Лисснер и Ю. Роман].

*[Laiškai] / Jankovskis (Jankowski) Benediktas – Adomui Zavadskiui* [online] http://elibrary.mab.lt/handle/1/6598 [доступ: 27.05.2020].

Lietuvos mokslų akademijos biblioteka, Rankraščių skyrius, LMAB, RS, F 18–25.

Lietuvos mokslų akademijos biblioteka, Rankraščių skyrius, LMAB, RS, F 7–654.

Rossijskij gosudarstvennyj istoričeskij arhiv (RGIA), f. 1343, op. 34, d. 2263 [Российский государственный исторический архив (РГИА), ф. 1343, оп. 34, д. 2263].